ПАДЗЕЯ

# МУЗЫКА СЛОВА

**24 мая ў Гродзенскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў па зроку" адбыўся конкурс мастацкага чытання па сістэме Брайля "Музыка слова". У якасці члена журы ў ім прыняў удзел Анатоль Уладзіміравіч Апанасевіч.**

Конкурс быў прымеркаваны да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таму ўсе творы былі прысвечаны тэме вайны. Паэты –ўдзельнікі вайны, паэты, якія загінулі пад час вайны і паэты, чыё дзяцінства прыпадае на гэтыя страшныя часы – такім было аўтарства твораў, выбраных для прачытання. Праз жрэбій канкурсанты вызначылі, якія творы яны будуць чытаць. Ніводзін з вершаў не паўтараўся.

Безумоўна, яркіх фарбаў конкурсу надалі і выступленні членаў журы пасля заканчэння конкурснай праграмы. Усе слухачы вельмі цёпла прымалі і выступленне Анатоля Уладзіміравіча Апанасевіча, які прачытаў некалькі сваіх вершаў. Ну, а напамінам аб гэтай сустрэчы стануць і аўтографы, якія пакінуў Анатоль Уладзіміравіч на памятных дыпломах.

**Алена МІХНЕВІЧ**
інструктар Гродзенскай абласной арганізацыі
ГА "БелТІЗ"

**На фота:** падчас конкурсу мастацкага чытання па сістэме Брайля "Музыка слова" ў Гродзенскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў па зроку" з удзелам члена СПБ, паэта Анатоля АПАНАСЕВІЧА. 24 мая 2019 года.




3-й областной
художественного
чтения
ДИПЛОМ
ДИПЛОМ




ГРОДНЕНСКАЯ
ОБЛАСТНАЯ

